# Бібліятэчны "Оскар" атрымалі...

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі падведзены вынікі галоўнага рэспубліканскага прафесійнага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры". Ён праводзіцца штогод і ўлічвае наватарства, крэатыў тых, хто адказвае ў краіне за прэстыж кніг і чытання. Дык хто ж ушанаваны дыпломамі і грашовымі прэміямі (ад 10 да 50 базавых велічынь)?**

Яўген РАГІН


**Газета** ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)

**КУЛЬТУРА** Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Галоўны рэдактар** — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ.

**Адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Вераніка МОЛАКАВА, Настасся ПАНКРАТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

**Дырэктар** — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна; **першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна; **намеснік дырэктара па маркецінгу** — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч. Тэлефон прыёмнай: (017) 290 22 50.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.** Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2017. Наклад 4 233. Індэксы 63875, 638752 Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 23.06.2017 у 19.30. Замова 2054. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.


У намінацыі "За пошукавую і даследчую працу" першую прэмію сярод гарадскіх і раённых устаноў атрымала Зэльвенская раённая бібліятэка. Сярод гарпасялковых і сельскіх — Казловіцкая сельская бібліятэка Калінкавіцкага раёна. Другая прэмія гэтай намінацыі — у Бабруйскай гарадской бібліятэкі № 4 імя Барыса Мікуліча. Сярод сельскіх устаноў уганаравана Сасноўская Віцебскага раёна. Трэцяе месца — у Жабінкаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, а трэцяя прэмія сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк — за Махроўскай Іванаўскага раёна.

Намінацыя "За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем". Першая прэмія сярод гарадскіх і раённых устаноў дасталася Баранавіцкай цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы. Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх стала Чэрнеўская сельская Дрыбінскага раёна. Другая прэмія сярод гарадскіх і раённых устаноў — у Горацкай раённай дзіцячай. Другой прэміяй сярод гарпасялковых і сельскіх ушанавана Камянюцкая сельская. Трэцяй — бібліятэка-філіял № 2 Гомеля. Трэцяя прэмія прысуджана і Дварышчанскай сельскай установе Лідскага раёна.

Намінацыя "За падтрымку і развіццё чытання". Сярод гарадскіх і раённых устаноў першая прэмія — у Вілейскай раённай цэнтральнай імя Ганны Новік. Салтаноўская сельская бібліятэка Рэчыцкага раёна прызнана лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх. Другая прэмія ў гэтай намінацыі — за Мінскай дзіцячай № 10. А сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк другая прэмія прысуджана Пагародзенскай сельскай Воранаўскага раёна. Трэцяя — у Пінскай цэнтральнай раённай імя Яўгеніі Янішчыц. Сярод гарпасялковых і сельскіх трэцяя прэмія — у Махаўскай сельскай Магілёўскага раёна.

У намінацыі "За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы" лепшай сярод гарадскіх і раённых устаноў прызнана Магілёўская цэнтральная гарадская імя Карла Маркса. Першую прэмію сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк атрымала Агарэвіцкая сельская Ганцавіцкага раёна. Другая прэмія прысуджана Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Сярод гарпасялковых і сельскіх другая прэмія — за Ржаўскай сельскай Слаўгарадскага раёна. Трэцяй прэміяй у гэтай намінацыі ўшанавана Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Івана Каладзеева. Трэцяя прэмія — і ў Сапоцкінскай гарпасялковай установы Гродзенскага раёна.

У наступных нумарах "К" галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вольга Какшынская распавядзе, чаму канкрэтна кожная з вышэйназваных устаноў перамагла ў рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры". **К**

**Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці вядучага майстра сцэны, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь ШЭЛЕСТАВА Уладзіміра Іванавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**